***ПАПЕЙКА А.А.***

# ПАЭЗІЯ А. ДУДАРА Ў КАНТЭКСЦЕ ЛІНГВАТЭКСТАЛАГІЧНАГА АСЭНСАВАННЯ

*УА "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова",*
*г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь*

Алесь Дудар (сапраўднае імя – Аляксандр Аляксандравіч Дайлідовіч) – адна з яркіх і трагічных фігур у беларускай літаратуры першай паловы XX ст. Ён быў адным з тых, каго расстралялі ў 1937 г. як членаў "*антысавецкай аб'яднанай шпіёнска-тэрарыстычнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі*" [1], але ў той час, калі пра гэта



ный архив библиотеки МГУ имени А.А.

"нельга было гаварыць", у афіцыйных звестках пра паэта ўказвалася, што ён памёр 25 лютага 1946 года [2].

Ужо ў самых першых вершах А.Дудара выразна праявілася такая рыса, як імкненне да максімальнай экспрэсіі вершаванага радка; гэта вынікала з асноўнай мэты твора – дабіцца максімальнага ўздзеяння на чытача. На ўзроўні рытму ў ранняй паэзіі А. Дудара гэта праяўляецца ў частым пропуску ненаціскных складоў, а агульны рытм пры гэтым падтрымліваюць склады націскныя. Таму вершаваныя радкі нагадваюць "паходны барабан", пры гэтым рытміка-інтанацыйную арганізацыю верша падкрэсліваюць ужытыя лексічныя сродкі. Так, у вершы "Я малады" аўтар адкрыта гаворыць пра тое, што "*кроў барабаніць – // заклікае ісці у паход*". Дарэчы, гэты ж верш служыць ілюстрацыяй да пропуску ненаціскных складоў; ніжэй прыводзяцца 1-я, 2-я і 5-я строфы, і агульная колькасць складоў у радках складае: першая страфа – 9, 8, 10, 9; другая – 9, 8, 10, 8; пятая – 10, 9, 10, 9:

*Хто прайшоў – галаву павесіў.*
*(Мільёны пудоў у гадах.)*
*Ну, а я малады – мне весела*
*разагнацца ў мяцежную даль.*

*Мне жыццё – сусветнае свята,*
*мне прапоны – большы разгон.*
*Я цяпер без багацця багаты*
*на зары квітнеючых дзён.*

‹...›

*Што ж рабіць, калі фарбы раніцы*
*у грудзёх завялі карагод;*
*што рабіць, калі кроў барабаніць –*
*заклікае ісці у паход?* ("Я малады")

Адзін з характэрных прыёмаў пабудовы верша ў А. Дудара – гэта цыклічнасць формы: першая страфа (радок, некалькі радкоў) часта прыводзіцца ў канцы твора, іншы раз у нязменным, іншы раз – у крыху зmененым выглядзе. Прычын такой прыхільнасці да паўтораў можна знайсці дзве. Па-першае, паўтор прыцягвае ўвагу чытача да пэўнай думкі, тым самым павышаецца ступень уздзеяння на чытача. Па-другое, ступень "канчатковасці", паўнаты выказанай думкі чытачом можа ўспрымацца або праз сюжэт (падзеі), або праз цыклічнасць формы; зыходзячы з таго, што вершы А. Дудара па большай частцы з'яўляюцца не "сюжэтнымі", а эмацыянальна-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

экспрэсіўнымі вершамі-"настроямі", можна зрабіць заключэнне, што цыклічная пабудова і прызначана для стварэння эфекту завершанасці выказвання.

Падкрэсленая экспрэсіўнасць маўлення, насычанасць паэтычных тэкстаў моцнымі вобразнымі сродкамі, выкарыстанне вобразаў-сімвалаў былі характэрнымі не толькі для паэзіі А. Дудара. Як адзначае І. Штэйнер, "А. Дудар заўсёды ў сваіх лепшых творах выкарыстоўваў яркія фарбы, незвычайныя тропы, адметную сімволіку, з дапамогай якіх рамантызавалася рэчаіснасць. Як і ўсе маладнякоўцы, ён бурапеніць рэчаіснасць..."[3] .Сапраўды, ва ўзгаданым ужо вышэй вершы "Я малады" сустракаюцца такія вобразы, пабудаваныя на гіпербалізацыі рэчаіснасці, як "*мільёны пудоў у гадах*", "*жыццё – сусветнае свята*", "*сэрца распаліць лёд*", "*вышэй бы за ўсіх узняцца*".

Экспрэсія, імклівасць маўлення на ўзроўні лексікі праяўляюцца ў тым, што ў вершах А. Дудара частотнай з'яўляецца лексіка са значэннем імклівага руху, хуткай змены падзей, гучання (*гучны, плешча, бурлівы* і пад.). На ўзроўні сінтаксісу імклівасць руху, хуткасць змены падзей у тэксце вядзе да ўжывання рознага тыпу "ўсечаных" канструкцый: няпоўных, эліптычных, намінатыўных сказаў і інш. Напрыклад, у вершы "Паўстанец" ёсць радкі: "*Яму хатаю – сіні бор, // Дахам – неба блакіт зялёны*" (чытач можа сам "падставіць" патрэбнае яму слова), "*Без суда... На старой асіне*" (адзін радок структурна роўны двум сказам). Верш "Беларусь" пачынаецца наступнымі радкамі: "*Край шумлівых лясоў... // Край дрымотных балот... // Край, адвечнаю крыўдай замучаны...*"

Дарэчы, пераважная большасць вершаў А. Дудара перадае поўнасцю адназначную ацэнку падзей, адносіны або пачуцці, выкліканыя той праблематыкай, якая і лягла ў аснову твора. Часта адбываецца рэзкае размежаванне свету на "стары" і "новы", прычым "старое" – паноў, багацеяў, святароў, а таксама мінулы лад жыцця наогул – трэба знішчыць, і на ачышчаным месцы будаваць новае жыццё.

Ухваляючы новы лад жыцця ў форме "маршавага верша", А. Дудар звычайна выкарыстоўвае дакладную рыфму – мужчынскую (націск на апошні склад), жаночую (націск на прадапошні склад), дактылічную (націск на трэці склад з канца радка). Важна пры гэтым, што паэт часта знаходзіць магчымасць зрыфмаваць або розныя часціны мовы, або розныя граматычныя формы адной і той



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

часціны мовы; гэта робіць мову верша больш глыбокай, разнастайнай, прыдатнай для ўспрымання чытачом. Напрыклад, у вершы "Паэты рэвалюцыі" (які з'яўляецца вельмі паказальным і характэрным у многіх адносінах) мы сустракаем наступныя рыфмы: *сыны – мы*; *спеў – гудзеў*; *вайны – кайданы*; *жылі – гульні*; *дня – вайна*; *гульнёй – агнявой*; *іх – нямых*. Узмацніць, падтрымаць дакладнасць рытму вершаванага радка дапамагае ўнутраная рыфма; так, у гэтым жа вершы ў сярэдзіне суседніх радкоў сустракаюцца наступныя сугучныя словы: *рэвалюцыі – кіпучае*; *калыскаю – агністыя*; *казкаю – цацкамі*; *натруджаных – абуджаны*; *песні мы – плесені*; *звонкае – агнятонныя*; *вясеннімі – ценьмі іх*; *апяваюцца – раніцу*.

Паэзіі многіх паэтаў уласціва частае выкарыстанне адных і тых вобразаў, праз якія раскрываюцца думкі, пачуцці, адносіны да рэчаіснасці. У А. Дудара адным з найбольш частых вобразаў з'яўляецца агонь, полымя, пажар: *дні агністыя*; *полымя палаючага дня*; *гук песні агнявой*; *агнём рытмуем іх* [песні]; *напевы агнятонныя* ("Паэты рэвалюцыі"). Яшчэ адзін характэрны вобраз у паэзіі А. Дудара – гэта сталь: *гоман сталі звонкае*; *сталёвым звонам мускулаў* (там жа).

Агульны ўзнёслы, маршавы настрой вершаў падтрымлівае гукава-колеравая гама твораў. На ўзроўні зроку ў паэтычных тэкстах часта сустракаецца чырвоны колер і яго адценні (што шмат у чым выклікана асаблівай сэнсавай насычанасцю гэтага паняцця ў паслярэвалюцыйны час); на ўзроўні слыху – гучны звон, вясёлы смех, маладая задорная песня: *Гучным спевам будзяцца аколіцы... // Маладога смеху плешча вал...*; *Усміхаюцца вясёлыя аколіцы* ("Сцеражыцеся"); *гоман сталі звонкае, удары малатка*; *песнямі вясеннімі звівае чарназём* ("Паэты рэвалюцыі"); *у сэрцы квітнее чырвань*; *пранясецца чырвоны конь* ("Паўстанец"); *гудзяць заводы, // працай жыццё звініць* ("Бацька на дымным заводзе..."); *зацвіла зара малінаю*; *Песня радаснымі ўсплёскамі // Зазвінела над далінаю* ("Вясковае"); *чырвонай істужкай // май аздобіць вясны блакіт*; *Пад напевы вясенніх званоў // ты вясну сабе сёння сасватаў...* ("Май").

Калі А. Дудару "не хапае" існуючых слоў, каб выказаць свае думкі і пачуцці, ён, як і многія іншыя тагачасныя паэты, прыбягае да стварэння ўласных слоў-наватвораў. Трэба адзначыць, што пераважная большасць такіх слоў добра зразумелая і без паэтычнага кантэксту, хаця з цягам часу (з прычыны некаторай штучнасці, "бурапеністасці") у лексічнай сістэме беларускай мовы так і не замацавала-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ся: *мазоліста-нязграбны* ("Сцеражыцеся"), *агнятонныя*, *срэбразвон* ("Паэты рэвалюцыі"), *сінякудры* ("Паўстанец"), *забуяніла* ("Кастусь Каліноўскі"), *жаўтатканая* ("За маім акном – абрывы"), *бяздонне* ("Цаліну алавяных хмар"), *атуманіў* ("Заблудзіла зялёная зорка"), *сінякрылы* ("Мятнуўся небасхіл пярунам сінякрылым"), *срэбраногія*, *сінегаловы* ("Асыпае чэрвень белы сад"), *наёжаныя* ("Машыніст"), *прозалаць*, *камуністыя* (Трыццаць пяць...), *буяней* ("Камяніца"), *красавіковы* ("Вясна 1932 года"), *нежнагалосы* ("Вясна").

*Літаратура*


1. Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. URL: http://be.wikipedia.org/wiki/Алесь_Дудар.– Дата доступу: 15.09.2012.

2. Дудар, А. Выбраныя творы / А. Дудар.– Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1959.– 128 с.

3. Штэйнер, І. "Мы дзеці рэвалюцыі, Кастрычніка сыны". Алесь Дудар / [Электроны рэсурс]. URL: http://www.petrikov.by/2012/04/my-dzeci-revalyucyi-kastrychnika-syny-ales-dudar-24-12-1904-29-10-1937/.– Дата доступу: 15.09.2012.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова